## ЛІТАРАТУРА

1. *Казаніна, В.* Да пытання вызначэння навукова-тэарэтычнага паняцця «арт-рынак антыкварных твораў мастацтва» / В. Казаніна // Роднае слова. – 2017. – № 11 (359). – С. 89 – 91.


## АЎТЭНТЫЧНАСЦЬ У НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

**Аўтэнтычнасць у народнай творчасці** (ад *англ.* authentic – сапраўдны) – *характарыстыка творчых і мастацкіх праяў як часткі паводзін вясковай супольнасці ў яе «матчыным» ландшафце, у спантанным натуральным самавыяўленні, якое захоўвае рэгіянальныя рысы.* Аўтэнтычная народная творчасць Беларусі характарызуецца галоўным чынам устойлівымі якасцямі мясцовага мастацкага стылю, у якім адлюстраваны светапогляд і адаптацыя суполкі да сацыяльнага і прыроднага атачэнняў: *матэрыялам мастацкіх артэфактаў, жанравай наменклатурай, стылем, выканаўчай манерай.* Аўтэнтычнае народнае мастацтва, вырванае са свайго асяродку, перанесенае ў рынкава-вытворчыя ўмовы, на сцэну ці на іншую этнічную глебу, апрацаванае, звычайна губляе свае станоўчыя і этнаэкалагічныя якасці.


## ЛІТАРАТУРА

1. *Дарашэвіч, Э.* Тэорыя фальклору : вучэб.-метад. дапам. / Э. Дарашэвіч; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск: БДУКМ, 2016. – С. 11.


## ЗБІРАЛЬНІЦТВА АРТЭФАКТАЎ НА ПАДСТАВЕ ФАЛЬКЛОРНЫХ КРЫНІЦ

**Збіральніцтва артэфактаў на падставе фальклорных крыніц** – *адзін з падыходаў у сінгалогіі* (ад *англ.* thing – рэч, навука пра пошук кладаў), *заснаваны на аналізе паданняў, казак, легенд з мэтай пошуку матэрыяльных каштоўнасцей, пра якія гэтыя крыніцы распавядаюць.* Абгрунтаваная ў 1940 годзе англійскім прафесарам Джэральдам Хопкінсам, сінгалогія выкарыстоўвае таксама гісторыка-апісальны, тыпалагічны, марфалагічны метады і прываблівае да сябе ўсё большую ўвагу грамадства. Як сведчыць рэчаіснасць, фальклорныя крыніцы, часам, – даволі надзейны арыенцір для мастацтвазнаўцаў, калекцыянераў і антыквараў. Нават такі прызнаны спецыяліст, як беларускі гісторык і антыквар Валянцін Рабцэвіч, адзначае, што: «Насамрэч такога роду "дакументы" – цалкам важкія, паўнавартасныя крыніцы для даследаванняў не толькі ў сферы фалькларыстыкі, але яшчэ археалогіі і нумізматыкі». Ён

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ